Другі дзень УНС: усе падрабязнасці тут

25.04.2024 09:41 | **Палітыка (/be/palityka)**

25 красавіка УНС працягвае работу. У парадку дня — зацвярджэнне Канцэпцыі нацбяспекі і Ваеннай дактрыны

Усебеларускі народны сход 25 красавіка працягвае сваю работу, паведамляе (https://www.belta.by/society/view/vns-25-aprelja-prodolzhaet-rabotu-v-povestke-dnja-utverzhdenie-kontseptsii-natsbezopasnosti-i-voennoj-630370-2024/) БелТА.

(ht



Фота Віктара Іванчыкава

Напярэдадні на пасяджэнні кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка быў абраны на пасаду старшыні VII УНС. Намеснікам старшыні выбраны Аляксандр Косінец. Дэлегаты таксама выбралі членаў Прэзідыума і прынялі рашэнні па шэрагу іншых арганізацыйных пытанняў.

У першы дзень работы УНС Аляксандр Лукашэнка выступіў з прамовай, у якой падрабязна расказаў аб ролі і месцы УНС у абноўленай палітычнай сістэме дзяржавы, сацыяльна-эканамічных дасягненнях Беларусі за гады суверэннага развіцця, а таксама аб становішчы ў свеце і вакол краіны.

> На парадку дня пасяджэння — пытанні аб зацвярджэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны. Гэта асноўныя дакументы, якія рэгламентуюць падыходы дзяржавы да забеспячэння ўласнай бяспекі ў розных сферах з улікам геапалітычных змен у свеце, прымяненне ваеннай сілы ў рамках рэагавання на існуючыя выклікі і пагрозы.

Праект новай рэдакцыі Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі быў ухвалены 20 лютага 2023 года на пасяджэнні Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь. Перш чым выносіць яго на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу, кіраўнік дзяржавы даручыў правесці яго грамадскае абмеркаванне. На працягу года было арганізавана больш за 70 дыскусійных пляцовак па абмеркаванні асноўных навел Канцэпцыі ва ўсіх рэгіёнах краіны, у дзяржаўных органах і арганізацыях, працоўных калектывах, навучальных установах, прафсаюзных і грамадскіх аб'яднаннях з прыцягненнем прадстаўнікоў навуковай і экспертнай супольнасці, асноўных рэлігійных канфесій. Для максімальнага ахопу аўдыторыі тэкст новай Канцэпцыі таксама быў размешчаны на Нацыянальным прававым Інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь.

У студзені бягучага года на пасяджэнні Савета Бяспекі кіраўніку дзяржавы і членам Савета бяспекі былі даложаны канкрэтныя прапановы, якія ў выніку грамадскага абмеркавання прапаноўвалася ўключыць у абноўленую Канцэпцыю. Перш за ўсё яны датычыліся дадатковай абароны інстытута традыцыйнай сям'і, павышэння ўзроўню сацыяльнай адказнасці бізнесу, пераадолення дыспрапорцый рэгіянальнага развіцця, канкрэтызацыі пераліку сіл забеспячэння нацыянальнай бяспекі, паняційнага апарата, парадку зацвярджэння сістэмы індыкатыўнай ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі і іншых.

> Што да новай Ваеннай дактрыны, яна не прадугледжвае кардынальнай рэвізіі палажэнняў ваеннай палітыкі дзяржавы. Актуальныя палажэнні засталіся нязменнымі, захаваны яе абарончы характар. У дакументе раскрыта змест ваеннай палітыкі. У прыватнасці падкрэсліваецца, што Беларусь — міралюбівая краіна, якая нікому не пагражае, а спробы ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы, а тым больш пагроза прымянення ваеннай сілы або агрэсія будуць спыняцца з выкарыстаннем усяго існуючага патэнцыялу.

Абодва асноўныя дакументы былі адобраны Саветам бяспекі ў лютым 2024 года і, у адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларусі, вынесены на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу.

Зала Палаца Рэспублікі гатова да другога дня Усебеларускага народнага сходу

(ht





Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

Генадзь Лепяшко: Абараняць краіну павінна не толькі армія, а і народ

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Генадзь Лепяшко**, гэтыя два дакументы — Ваенная дактрына і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, акрамя экспертыз прафесіяналаў, прайшлі абмеркаванне ў народзе. «Як кажа Прэзідэнт, вайна — гэта ўсенародная справа, абараняць краіну павінна не толькі армія, а і народ, — пераканаы дэпутат. — Тое, што сёння Усебеларускі народны сход будзе прымаць удзел у адабрэнні гэтых дакументаў, — акурат паказчык дэмакратычнасці нашага грамадства, узаемадзеянне народа і ўлады».

(ht



Па словах парламентарыя, дэлегаты, выбраныя ва Усебеларускі народны сход, з'яўляюцца лепшымі з найлепшых. «Яны прадстаўляюць розныя слаі нашага насельніцтва, пасля нашага веча дэлегаты паедуць у свае акругі, да сваіх людзей, якія іх выбіралі, давядуць тыя задачы, якія тут будуць пастаўлены, і мы разам з імі будзем працаваць на карысць нашай Радзімы, — канкрэтызаваў Генадзь Лепяшко. — Заканадаўчы жадаюць, каб гэтыя два дакументы — Ваенная дактрына і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — знайшлі сваю падтрымку ў нашага Сходу, бо іх стваралі прафесіяналы, абмеркаванне ішло ў калектывах, на прадпрыемствах, таму голас народа быў пачуты».

Уладзімір Шокаў: Мы, людзі ваенныя, таму хочам, каб мірнае неба такім і заставалася



Па словах **старшыні Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць» Уладзіміра Шокава**, абстаноўка ў свеце і каля нашых граніц вельмі складаная. «Мы, людзі ваенныя, таму хочам, каб мірнае неба такім і заставалася, і для гэтага ўсё павінны зрабіць усе жыхары нашай краіны, — лічыць ён. — Кожны на сваім месцы павінен працаваць са знакам якасці, як казаў Прэзідэнт, выдатна валодаць сваёй прафесіяй, умець абараняць Радзіму, але каб гэтыя ўменні не прыйшлося прымяняць на практыцы. Невыпадкова ў краіне займаюцца ваенна-патрыятычным выхаваннем нашых школьнікаў, у якім удзельнічаюць і ветэраны баявых дзеянняў. Хочам перадаць моладзі свой вопыт, у тым ліку навучаем ваеннай справе — усяму, што можа спатрэбіцца. Каб кожны малады чалавек мог абараніць сябе, сваю маці і, вядома, Радзіму. А для гэтага, як кажа Прэзідэнт, кожны павінен на сваім працоўным месцы рабіць тое, што павінен, і рабіць гэта якасна».

Аляксандр Бурда: Задача моладзі — рабіць усё дзеля таго, каб нашы дзеці жылі яшчэ лепш, чым мы

(ht



Начальнік упраўлення дзяржаўнага вытворча-гандлёвага аб'яднання «Белмастацпромыслы» Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Бурда ўзгадаў першы Усебеларускі народны сход, які прайшоў у 1996 год, дзе Прэзідэнт нашай краіны сказаў вельмі важныя словы, які актуальныя дагэтуль — толькі народ мае права вырашаць свой лёс. «Ваенная дактрына і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, які будуць разглядацца, маюць вызначальнае, стратэгічнае значэнне для забеспячэння бяспекі нашай краіны, яе развіцця з палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах, для таго, каб народ Беларусі ствараў на карысць росквіту нашай краіны, — падкрэсліў ён. — А моладзь у гэтым будзе прымаць самы непасрэдны ўдзел. На працягу 30 гадоў наша старэйшае пакаленне будавала моцную і незалежную краіну, мільёны беларусаў прыкладалі неймаверныя намаганні для таго, каб мы сёння жылі пад мірным небам, былі забяспечаны хлебам, харчаваннем, каб нашы дзеці маглі спакойна хадзіць у дзіцячыя садкі і школы, расці, развівацца. І, вядома, задача моладзі — гэтаму садзейнічаць, і рабіць усё дзеля таго, каб нашы дзеці жылі яшчэ лепш, чым мы».

Марына Лянчэўская: Вайны не хочам, але калі да нас нехта прыйдзе з мячом, мы адкажам

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Марына Лянчэўская лічыць вельмі важным, што такія стратэгічныя дакументы, як Канцэпцыя нацыянальная бяспекі і Ваенная дактрына, прымаюцца на Усебеларускім народным сходзе. «У іншых дзяржавах такіх прэцэндэнтаў няма, — падкрэсліла дэпутат. — Ранейшая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі была прынята ў 2010 годзе, яна была грунтоўная, актуальная для таго часу. Памяняліся ўмовы, з'явіліся новыя выклікі, пагрозы. Таму вельмі важна выпрацаваць канкрэтныя індыкатары для таго, каб гэтым выклікам і пагрозам супрацьстаяць».



Парламентарый нагадала, што Канцэпцыя абноўлена на 70%. «З'явіўся абсалютна новы від бяспекі, як біялагічная бяспека, і гэта сведчыць аб тым, што мы ідзем у нагу з часам, — звярнула ўвагу яна. — Навэлай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі стала такое новае паняцце, як электаральны суверэнітэт. Гэта важна, асабліва ў гэты электаральны перыяд. Мы не дазваляем нікому ўмешвацца ў выбары ў нашай краіне. Дарэчы, дэпутаты прынялі шэраг законаў для таго, каб замацаваць

(https://www.sb.by/)

канстытуцыйнага органа — гэта фундамент будучай Беларусі. Рызыкаў з кожным годам будзе больш. Сёння сістэма ўлады працуе цудоўна. Але трэба працаваць на перспектыву, каб нашым дзецям і ўнукам было спакайней». Адег Гайдукевіч адзначыў, што ў састаў Прэзідыўма, як і ў склад членаў УНС увайшлі людзі розных узростаў, розных сацыяльных слаёў, што сімвалізуе народную дэмакрытыю.

Па словах Марыны Лянчэўскай, вельмі грунтоўным і своечасовым дакументам з'яўляецца Ваенная дактрына. «Самае галоўнае, што Ваенная дактрына застаецца абараняльнай, — падкрэсліла дэпутат. — Гімн нашай дзяржавы невыпадкова пачынаецца са слоў „мы беларусы, мірныя людзі". Так і ёсць. І дактрынай мы падкрэсліваем, што вайны не хочам, але калі да нас нехта прыйдзе з мячом, мы адкажам».

Алег Гайдукевіч: Сёння сістэма ўлады працуе цудоўна. Але трэба працаваць на перспектыву

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег Гайдукевіч прызнаўся, што яго закранула выступленне Прэзідэнта, бо яно было вельмі чалавечае: «Ён выступаў не толькі як кіраўнік дзяржавы, як палітык. Ён выступаў як чалавек, які вельмі хвалюецца, што будзе з яго роднай краінай не праз пяць гадоў, а праз 30-50 гадоў. Ён глядзіць у будучыню. І тое, што мы сёння ўсе разам працуем на Усебеларускім народным сходзе ў якасці



Выбар Аляксандра Лукашэнкі старшынёй Усебеларускага народнага сходу Алег Гайдукевіч назваў абсалютна правільным крокам на перспектыву. «Прэзідэнт — лідар нацыі. УНС павінен узначальваць лідар. У прэзідыуме прадстаўлены чатары кіраўнікі палітычных партый — гэта ўвесь палітычны спектр краіны. Я ўспамінаю лозунг Прэзідэнта, агучаны ў 1994 годзе „я не з правымі і не з левымі. Я не партыямі, я з народам". А сёння ўсе партыі разам з ім, бо яны таксама з народам. Для мяне гэта важна, што Прэзідэнт змог аб'яднаць усіх беларусаў, усе палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. Ён сапраўдны лідар», — сказаў дэпутат.

Алег Раманаў: УНС — гэта падзея, якая стварае будучыню

(ht



Старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» і РГА «Белая Русь», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег Раманаў заўважыў, што дэлегаты Усебеларускага народнага сходу — гэта людзі, якія знаходзяцца ў цэнтры гістарычных падзей, людзі, якія вызначаюць, па якім шляху пойдзе наша краіна. «Гэта падзея, якая стварае будучыню. Я ўпэўнены, што менавіта так мы павінны ацэньваць Усебеларускі народны сход, сыходзіць з менавіта такога яго статусу. І адчуваць сваю адказнасць пры прыняцці рашэнняў, якія вызначаюць лёс нашай краіны», — падкрэсліў Алег Раманаў. Па яго словах, жыць у пераломныя моманты гісторыі хоць і няпроста, але вельмі цікава. «Гэта дае адчуванне, што ты паўплываў на развіццё сваёй дзяржавы», — сказаў ён.

Аляксандр Румак: Гэта яшчэ адна адметнасць нашага грамадства — што людзі розных канфесій адзіныя



Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Аляксандр Румак падкрэсліў, што ў сваім выступленні Прэзідэнт заклаў асноўныя вектары развіцця і для новых пакаленняў беларусаў. «Я думаю, што сёння закладваюцца такія гарантыі захавання незалежнасці нашай краіны, якія дазволяць і надалей развівацца. Краіна маладая, тры дзесяцігоддзі для гісторыі няшмат. І вельмі важна для маладой краіны стварыць і закласці прававыя гарантыі далейшага развіцця і забяспечыць пераемнасць пакаленняў», — сказаў ён.

Аляксандр Румак звярнуў увагу, што сіла беларусаў у тым, што дзяржава шмат робіць, каб шматканфесіянальнае і шматнацыянальнае грамадства жыло ў гармоніі і згодзе. Ён нагадаў, што ў Беларусі жывуць людзі 25 канфесій і рэлігійных накірункаў і людзі больш за 150 нацыянальнасцей. «На жаль шмат прыкладаў, калі на рэлігійнай аснове ўзнікаюць гарачыя канфлікты. А ў нас у прэзідыуме УНС знаходзяцца прадстаўнікі дзвюх найбольш уплывовых канфесій — праваслаўнай і каталіцкай. У зале прадстаўнікі мусульман і іудзеяў. Гэта яшчэ адна адметнасць нашага грамадства — што людзі розных канфесій адзіныя і ўсе разумеюць, як важна жыць у ладзе, і ў павазе адзін да аднаго», — падкрэсліў Упаўнаважаны.

(https://www.zvezda.by/)

Андрэй Анісімаў: Нердынарны, няпросты час вядзе нас да таго, каб мы ўсім народам, усёй краінай прымалі правільныя рашэнні

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Андрэй Анісімаў падзяліўся, што вельмі хвалюча быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. «У такой складанай абстаноўцы задаецца вектар па забяспячэнні бяспекі і стабільнасці ўсёй краіны. Кожны дэлегат павінен гэта разумець. І кожны беларус павінен разумець, што іх голас і іх уклад у развіццё краіны важны і ён будзе гучаць на УНС праз дэлегатаў, якіх абраў народ», — сказаў ён.



Андрэй Анісімаў заўважыў, што складаны час нараджае моцных людзей. «Нердынарны, няпросты час вядзе нас да таго, каб мы ўсім народам, усёй краінай прымалі правільныя рашэнні, разам іх абмяркоўвалі талакой, на вечы і знаходзілі станоўчае рашэнне. І такім чынам, мы будзем упэўненыя, што гэта рашэнне прыняў увесь народ, а не асобная група кіраўнікоў у закрытых кабінетах. Рашэнні УНС прынятыя ўсім народам. І развівацца мы будзем усёй краінай», — заявіў дэлегат.

Андрэй Нікіцін: Кожнае рашэнне, якое прымалася на папярэдніх УНС, было выканана ў поўным аб'ёме. Гэта паказвае, што ў нас словы не разыходзяцца з дзеяннямі



Андрэй Нікіцін, старшыня праўлення Магілёўскага абласнога аддзялення фонда міру, старшыня Каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яданняў і палітычных партый Магілёўскай вобласці, падкрэсліў, што ва ўмовах беларускай стабільнасці, УНС — гэта яшчэ адна нагода, каб людзі маглі адчуць сябе ўпэўнена. «Калі Канстытуцыю народ прыняў, і там прапісана, што павінен дзейнічаць найвышэйшы канстутыцыйны орган, ён павінен быць самым дастойным чынам сфарміраваны. Так і адбылася», — сказаў ён.

Па словах Андрэя Нікіціна, выбар кіраўніцтва Усебеларускага народнага сходу абсалютна правільны, ён дазволіць народу адчуваць сябе ў бяспецы, што сёння самае важнае. «Кожнае рашэнне, якое прымалася на папярэдніх УНС, было выканана ў поўным аб'ёме. Гэта паказвае, што ў нас словы не расходзяцца з дзеяннямі, ні на адным узроўні. Для мяне важна, каб мы маглі самі, вярнуўшыся ў свае гарады, з тымі, хто нас накіраваў, раставіць усе акцэнты і працаваць у адпаведнасці з

(https://www.butb.by/)

прынятымі на УНС рашэннямі так, каб дзяржаўная палітыка была эфектыўнай», — падкрэсліў Андрэй Нікіцін.

Антаніна Кошаль: Дзякуй, што пасля спартыўнай кар'еры мы застаёмся запатрабаванымі. І працягваем адстойваць інтарэсы сваёй Радзімы

Алімпійская чэмпіёнка 1972 года, старшыня грамадскага аб'яднаня «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» Антаніна Кошаль падкрэсліла, што УНС — гэта яшчэ і выдатная нагода сустрэцца са сваімі сябрамі і аднадумцамі. «Вельмі хочацца, каб усе прынятыя рашэнні былі рэалізаваны. Пытанні якія мы тут абмяркоўваем накіраваныя на захаванне міру, на паляпшэнне дабрабыту нашых людзей. І няхай так будзе на практыцы», — сказала яна.



Антаніна Кошаль параўнала значныя палітычныя мерапрыемствы са спартыўнымі спаборнцітвамі — і там, і там дзейнічаюць у інтарэсах сваёй краіны. «Дзякуй, што пасля спартыўнай кар'еры мы застаемся запатрабаванымі. І працягваем адстойваць інтарэсы сваёй радзімы, толькі ўжо не на спартыўных, а на палітычных пляцоўках», -падкрэсліла алімпійская чэмпіёнка.

Глеб Лапіцкі: УНС паказвае, што людзі культуры ў Беларусі не адарваныя ад палітычнага жыцця краіны

Генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск», дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар», член Савета Рэспублікі Глеб Лапіцкі заўважыў, што УНС, хоць і не свята, але мае святочную атмасферу. «Я сябе адчуваю стваральнікам навейшай гісторыі Беларусі. Гэта неверагодна. Я трэці раз удзельнічаю ва Усебеларускім народным сходзе. Кожны раз гэта хвалююча. А сёлета яшчэ і роля сенатара дадае адказнасці», — падзяліўся ён.



Глеб Лапіцкі падкрэсліў, што УНС паказвае, што людзі культуры ў Беларусі не адарваныя ад палітычнага жыцця краіны. «Культура не па-за палітыкай. Культура над палітыкай. Культура — гэта дыпламатычны атрад палітыкаў. Гэта дэманструе і „Славянскі базар". Што б ні адбывалася ў свеце — на нашых флагштоках тры дзясяткі сцягаў кожны год», — заўважыў ён.

(https://www.zvyazda.by/)

Дзмітрый Шаўцоў: Усебеларускі народны сход выходзіць на якасна новы ўзровень, выводзіць краіну на новы якасны ўзровень



Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Дзмітрый Шаўцоў падкрэсліў, што ўдзел ва Усебеларускім народным сходзе надае матывацыі на плённую працу. «На маю думку, развіццё нашай краіны можна параўнаць з нядаўнім палётам нашай касманаўткі ў космас. Калі касмічны карабль ужо ўзляцеў, а ўсе непатрэбныя дэталі адпадаюць. Сёння Усебеларускі народны сход выходзіць на якасна новы ўзровень, выводзіць краіну на новы якасны ўзровень», — заявіў ён. Дзмітрый Шаўцоў заўважыў, што ніколі паўнамоцтвы дэлегатаў УНС не былі такімі шырокімі, як сёння. «Мне цікава, у кагосьці сёння павернецца язык сказаць нешта наконт аўтарытарнасці ў Беларусі? Ці, можа нехта з заходніх краін можа пахваліцца такім вялікім калектыўным рашэннем і здольнасцю калектыўна прымаць рашэнні? Больш за тысячу дэлегатаў валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы, правам зацвярджаць асноўныя накірункі развіцця краіны. Паўнамоцтвы, якія раней ляжалі на плячах Прэзідэнта, сёння перададзены народу», — заўважыў дэпутат. Ён перакананы, што зараз краіна возьме зусім іншую скорасць у развіцці эканомікі, знешняй палітыцы, ваеннай стратэгіі. «Гэта дапаможа нам стаць больш незалежнымі, больш самастойнымі, паказваць сваім апанентам, якія няроўна дыхаюць у адрас Беларусі, што мы здольныя за сябе пастаяць», — сказаў Дзмітрый Шаўцоў.

Рыгор Бысюк: Кіраўнік дзяржавы бачыць, што нельга адыходзіць ад урокаў гісторыі. І досвед правядзення УНС таму пацверджання



Рыгор Бысюк, дэлегат ад Рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў выказаў упэўненасць, што Усебеларускі народны сход яшчэ больш аб'яднае нацыю. «Перад намі стаіць задача ствараць, працаваць. І разам мы пабудуем цудоўную Беларусь», — адзначыў ён. Па яго словах, УНС адыгрываю вялікую ролю ў захаванні гістарычнай памяці і найлепшых дасягненняў нашага народа. «Калі ўспомніць 90-я гады, калі ўсё гэта толькі пачыналася і калі паглядзець, якіх поспехаў дасягнула наша краіна

(https://www.butb.by/)

— усялякія сумненні адпадаюць. Прагрэс відавочны. Усе ведаюць, якая ўвага дзяржавы ўдзяляецца нашым помнікам, нашай гістарычнай спадчыне. Узяць да прыкладу Брэсцкую крэпасць, Хатынь. За гэтыя гады мемарыяльныя комплексы вельмі змяніліся. Кіраўнік дзяржавы за эканамічнымі, гаспадарачымі пытаннямі бачыць, што нельга адыходзіць ад захвання гістарычнай спадчыны і засваення ўрокаў гісторыі. І досвед правядзення УНС таму пацверджанне», — сказаў ён.

Яўген Пуставой: УНС — гэта гісторыя развіцця нашай сучаснай дзяржаўнасці і станаўлення незалежнай Беларусі

Дэпутат Мінскага гарадскага Савета дэпутатаў, журналіст Яўген Пуставой прызнаўся, што быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу адказна і знакава. «Знакава таму, што сёмы Усебеларускі народны сход, але ўпершыню з такімі паўнамоцтвамі. Мы бачым, што адбываецца вакол нас. І важна захваць тое, што мы маем. УНС — гэта гісторыя развіцця нашай сучаснай дзяржаўнасці і станаўлення незалежнай Беларусі. Прыйшоў час не толькі будаваць, але і абараняць. І абараняць не зброяй, а найперш, кансалідацыяй грамадства. Для гэтага і створаны УНС. Мы краіна адзінага духу. УНС — гэта і страхоўка, і накірунак дзейнасці. Нездарма час выбраў нас», — заявіў ён.



Дэлегат падкрэсліў, што беларусы — гэта міралюбівая нацыя, якая нават складаныя задачы вырашае лагодна і пяшчотна. І гэта закладзена і ў пасланні Прэзідэнта да народа, якое цяпер будзе агучвацца на Усебеларускім народным сходзе. «Гэты зварот адрасаваны не толькі дэлегатам, але і кожнаму жыхару нашай краіны, усім дзесяці мільёнам, якія неабаякавы лёс нашай краіны», — сказаў ён.

Зінаіда Пянькова: Усебеларускі народны сход як нішто аб'ядноўвае людзей

Зінаіда Пянькова, ганаровы жыхар Магілёва, старшыня Магілёўскай гарадской ветэранскай арганізацыі, удзельнічае ва Усебеларускім народным сходзе з самага пачатку яго гісторыі. «Мне ёсць, з чым параўноваць. Я ўпэўнена, што гэты Усебеларускі народны сход як нішто аб'ядноўвае людзей. Сярод дэлегатаў людзі розных прафесій, розных узростаў. Яны павязуць усё, што тут пачуюць, у свае калектывы. Найперш, гэта ідэя кансалідацыі грамадства, усіх людзей, якія жывуць у нашай краіне. І, канешне, дапамога адзін аднаму. Калі мы будзем падтрымліваць адзін аднаго, то ў нас будзе самая лепшая краіна ў свеце», — адзначыла яна.

(ht



Зінаіда Пянькова ўсё жыццё працавала ў адукацыі. Яна ўпэўнена, сёння для выхавання грамадства, трэба больш размаўляць з людзьмі, калектывамі, моладзю. «Чым больш мы, дэлегаты УНС, грамадскія дзеячы будзем сустракацца з людзьмі, расказваць, што на самой справе адбываецца, тым мацней будзе вера людзей у заўтрашні дзень», — падкрэсліла дэлегат УНС.

Мікіта Рачылоўскі: Я ўпэўнены, што кожны делегат адчувае сябе часткай гісторыі, бо так яно і ёсць



Для старшыні Маладзёжнага парламента Нацыянальнага сходу Мікіты Рачылоўскага, гэта першы Усебеларускі народны сход і адразу ў Канстутыцыйным статусе. «Для мяне гэта вялікі гонар, вялікі давер. Мы разумеем, што гэта пасяджэнне задасць вектары нашага развіцця. Гэта сапраўды гістарычная падзея. Я ўпэўнены, што кожны делегат адчувае сябе часткай гісторыі, бо так яно і ёсць. Мы разумеем, што на працягу пяці гадоў прыйдзецца працаваць, не пакладаючы рук для таго, каб апраўдаць гэты высокі давер. Я як дэлегат ад Беларускага Рэспубліканскага саюза моладзі разумею, што на мяне ўскладзена вялікая місія прадстаўляць інтарэсы і законыя правы нашых маладых людзей. Паколькі ў нас ёсць магчымасць працаваць у кожным рэгіёне нашай краіны, мы будзем праводзіць актыўна сустрэчы з моладдзю. Тут вельмі добра кладзецца сумесны праект Маладзёжнага парламента і БРСМ „Маладзёжны сход". Адразу пасля УНС мы пачынаем праводзіць сустрэчы з моладдзю па ўсёй краіне, дзе будзем атрымліваць зваротную сувязь ад маладых людзей, акумуляваць яе і самыя важныя і цікавыя прапановы выносіць для разгляду на Усебеларускім народным сходзе, каб погляды і меркаванні моладзі былі пачуты і бачныя з трыбуны УНС», — расказаў ён.

Абу-Бекір Шабановіч

Мы супрацьстаялі і будзем супрацьстаяць негатыву

(ht



Старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі муфцій Абу-Бекір Шабановіч расказаў, што меў гонар прысутнічаць на ўсіх Усебеларускіх народных сходах, якія адбываліся ў гісторыі нашай суверэннай краіне. «Мяне радуе, што на найвышэйшым узроўні адбываецца абмеркаванне самых галоўных праблем дзяржаўнасці і жыцця грамадства, — падзяліўся ён. — Самае галоўнае сёння, у час супрацьстаяння Захаду з намі, светам усходніх славян, мы — прыхільнікі жыцця славян».

Як паведаміў муфцій, мусульманская абшчына Беларусі падтрымлівае ўсе рашэнні Аляксандра Лукашэнкі, урада ва ўмацаванні братэрства, узамапаразумення. «Для таго, каб наша дзяржава і надалей захавалася, выстаяла ў супрацьстаянні з Захадам, які літаральна па ўсіх кірунках імкнецца ўздзейнічаць на нашу родную Беларусь, — удакладніў ён. — На нас ідзе ўсебаковае ўдзеянне — з укараненнем негатыву ў наша жыццё. Але мы супрацьстаялі і будзем гэтаму супрацьстаяць гэтаму — дзеля захавання міру, стабільнасці, раўнавагі ў нашым грамадстве, умацавання асноў дзяржаўнага жыцця».

Сяргей Рачкоў: Беларускі народ яшчэ раз праявіў сваю мудрасць, калі падчас рэферэндума прыняў рашэнне надаць канстытуцыйны статус УНС



Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей Рачкоў заўважыў, што не кожнаму ўдаецца ў жыцці прыняць удзел у гістарычных падзеях. А УНС — гэта гістарычная падзея для нашай краіны, для нашай дзяржавы, для нашага народа. «Беларускі народ яшчэ раз праявіў сваю мудрасць, калі падчас рэспубліканскага рэферэндума аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю прыняў рашэнне надаць канстытуцыйны статус Усебеларускаму народнаму сходу. На мой погляд, вельмі справядліва і правільна паступілі дэлегаты, якія выбралі Прэзідэнта Беларусі старшынёй УНС. Аляксандр Рыгоравіч — лідар і краіны, і нацыі. Гэта пераемнасць апраўдана. Сёння складаны час, асабліва з пункту гледжання міжнароднай сітуацыі, палітыкі, таму неабходна трымаць уладныя паўнамоцтвы ў адных руках, каб аператыўна і своечасова адказваць на сучасныя выклікі», — сказаў ён.

(https://www.belta.by)

Парламентарый падкрэсліў, што беларусам было вельмі важна пачуць параўнальны аналіз таго, што было ў 1990-я гады, і таго, што беларусы маюць сёння, які прадставіў у сваім выступленні Прэзідэнт. «Гэты аналіз неабходны, каб паказаць народу, і найперш моладзі, які шлях мы прайшлі. Зараз ідзе змена пакаленняў, і трэба паказваць маладым, як мы жылі, якія праблемы вырашылі, дзякуючы мудрасці народа і яго адзінства. Тэма адзінства сёння акутальная як ніколі. Мы бачым, што ў свеце адбываецца. Там, дзе няма адзінства, там пачынаюцца войны. А адзіная Беларусь ідзе сваім шляхам, нарошчвае свой патэнцыял, пашырае кола сяброў. Тое, што Захад зрабіў у адносінах да Беларусі — гэта стратэгічная памылка. Мы ідзём зараз на Усход. Мы раней мала ўвагі ўдзялілі Афрыцы, Лацінскай Амерыцы, але зараз мы ўбачылі, які там вялікі патэнцыял. І крок за крокам мы ідзём наперад у сваім развіцці. А Усебеларускі народны сход мабілізуе, аб'ядноўвае і вызначае стратэгію на будучыню», — пераканаы Сяргей Рачкоў.

Яўген Каваленка: Лагічны крок — наданне Усебеларускага народнаму сходу канстутыцыйнага статусу. Гэта прыступка ў далейшае развіццё



Міністр юстыцыі Яўген Каваленка падкрэсліў, што Усебеларускі народны сход як Канстытуцыйны орган, як суполка, як орган народаўладдзя прайшоў вялікі шлях. «Пачынаючы з першага Усебеларускага народнага сходу, ён эвалюцыянаваў, развіваўся разам з беларускай дзяржаўнасцю. Мы разам будавалі беларускую дзяржаўнасць, праводзілі УНС. І лагічны крок — наданне Усебеларускага народнаму сходу канстутыцыйнага статусу. Гэта крок доўгачаканы, крок вельмі правільны. І гэта прыступка ў далейшае развіццё. Гэта задзел на будучыню з тым, каб найважнейшыя дзяржаўныя пытанні абмяркоўваліся ўсім народам», — сказаў ён. Міністр заўважыў, што цяпер пасяджэнне УНС будзе праводзіцца не радзей чым адзін раз у год. Па яго словах, гэта дае новыя дадатковыя магчымасці для ўзважанага прыняцця найважнейшых для краіны рашэнняў.

Міхаіл Пінчук: Дзякуючы ўдзелу ва УНС у мяне ёсць магчымасць, яшчэ больш дапамагаць нашым ветэранам



(https://www.belta.by)

Дырэктар Палаца культуры ветэранаў Міхаіл Пінчук расказаў, як досвед удзелу ва УНС дапаможа яму ў будучыні: «Для мяне вельмі знакава ўдзельнічаць ва Усебеларускім народным сходзе. Наш Палац культуры ветэранаў аб'ядноўвае ветэранаў з усёй краіны. У нас праходзіць у месяц да 20 ветэранскіх мерапрыемстваў. Нашы ветэраны надзвычай актыўныя. І тое, што знаходжуся тут, тое, што я вынясу адсюль, і тое, што я ў перспектыве змагу зрабіць, дзякуючы УНС, для нашых ветэранаў — гэта вялізны досвед і вялікая карысць. Дзякуючы ўдзелу ва Усебеларсускім народным сходзе, у мяне ёсць магчымасць, яшчэ больш дапамагаць нашым ветэранам», — сказаў ён.

У чым сутнасць Ваеннай дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі

Дэлегаты Усебеларускага народнага сходу выказалі свае меркаванні наконт прадстаўленых Ваенных дактрыны і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Людзі розных прафесій, розных поглядаў і інтарэсаў – таму і меркаванні былі рознымі, што дазволіла разгледзець гэтыя найважнейшыя дакументы з усіх бакоў.

Алег Баранаў: новыя палажэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі навукова абгрунтаваныя



Фота БелТА

Акадэмік-сакратар НАН Беларусі Алег Баранаў падкрэсліў, што новыя палажэнні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі маюць дакладнае навуковае абгрунтаванне. Асобна ён адзначыў важнасць і своечасовасць уключэння ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі новых палажэнняў, якія гарантуюць біялагічную бяспеку. "Час, які прайшоў пасля пандэміі каранавіруса, выявіў новыя факты ў дачыненні да крыніц і ўзбуджальнікаў асабліва небяспечных вірусных інфекцый, выпрабаванні біялагічнай зброі на тэрыторыі сумежных краін з выкарыстаннем розных відаў патагенных мікраарганізмаў, а таксама насякомых у якасці іх пераносчыкаў. Нават звычайныя камары пасля іх спецыяльнай апрацоўкі здольныя распаўсюджваць розныя віды інфекцыйных захворванняў. Усё гэта толькі пацвердзіла правільнасць і своечасовасць прынятых намі мер", - падкрэсліў ён. Пры гэтым, акрамя ўвядзення ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі новай сферы, з улікам павышэння значнасці біялагічных рызык і выклікаў дадаткова была распрацавана і галіновая Канцэпцыя нацыянальнай сістэмы забеспячэння біялагічнай бяспекі. .

Вадзім Гігін: Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі – гэта праграма міру



Фота БелТА

(https://www.sb.by/)

Дарэчы, Палаты прадстаўнікоў Вадзім Гігін заўважыў, што Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі гэта не толькі асноўны ваенна-палітычны, нават сацыяльна-эканамічны дакумент, але і ідэалагічны. “Канцэпцыя развівае тыя сэнсы, якія былі закладзены ў тэкст Канстытуцыі, які прынялі на рэферэндуме 27 лютага 2022 года. У першую чаргу, гэта зацвярджэнне каштоўнаснай асновы нашага грамадства. Вось тыя самыя стратэгічныя нацыянальныя інтарэсы - гэта і ёсць пастулаты, якія павінны складаць базіс ідэалогіі беларускай дзяржавы: абарона традыцыйных каштоўнасцей, адстойванне гістарычнай праўды, патрыятычнае выхаванне, пераемнасць пакаленняў. Гэта ўсё тое, што складае непасрэдна паняцце ідэалогіі як сістэмы ідэй і поглядаў”, - сказаў Вадзім Гігін.

> Адначасова дакумент дае гарантыі развіцця асобаснага патэнцыялу грамадзян, жыццядзейнасці кожнага, адзначыў дэпутат. “Чырвонай ніткай праз увесь тэкст праходзіць прыярытэт незалежнасці, суверэнітэту і самабытнасці айчыннай палітычнай сістэмы", - падкрэсліў парламентарый.

Вадзім Гігін назваў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі праграмай міру: “У ёй няма ніякіх мілітарысцкіх палажэнняў, поўнасцю адсутнічае лязганне зброяй ці пагроза ў чыйсьці бок. І гэта выгадна адрозніваe і нашу Канцэпцыю нацыяльнай бяспекі, і Ваенную дактрыну ад таго, што прымаюць у краінах НАТА”. Парламентарый падкрэсліў, што Беларусь была і застаецца донарам міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. “А дасягнуць гэтага стану магчыма толькі пры наяўнасці ўнутранай згуртаванасці, умацавання народнай згоды і абароны нашых традыцыйных каштоўнасцей", - падкрэсліў Вадзім Гігін.

Мікалай Бузін: Беларусь не прымае сілавога дыктату і заўсёды гатова да дыялогу



Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў Мікалай Бузін у сваім выступленні звярнуў увагу, што цяпер планета планета ўвайшла ў гарачую стадыю пераўладкавання свету. “Гэта вядзе да росту колькасці і інтэнсіўнасці ўзброеных канфліктаў, трансфармацыі міждзяржаўнага процiборства і ўзрастання значнасці ваеннай сілы”, - сказаў ён. Па словах парламентарыя, не выклікае сумнення, што ў перспектыве ўзровень ваеннай небяспекі не зменшыцца. А таму Беларусь будзе вымушана адстойваць свой суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць. Менавіта для гэта і адпрацоўваецца Ваенная дактрына. Мікалай Бузін падкрэсліў, што дакумент не прадугледжвае кардынальных змяненняў палажэнняў ваеннай палітыкі дзяржавы, захоўвае міралюбівую рыторыку і абарончую накіраванасць. "Яна разглядаецца як сістэма поглядаў на падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі, забеспячэнне ваеннай бяспекі дзяржавы, - сказаў ён. - Па сутнасці, абноўленая Ваенная дактрына расстаўляе ўсё на свае месцы і гаворыць нармальнай мовай аб тых працэсах, якія адбываюцца ў свеце. У дакуменце вызначаны знешнія і ўнутраныя ваенныя небяспекі для нашай краіны. Асобны акцэнт зроблены на спробах асобных дзяржаў і кааліцый забяспечыць сваё лідарства шляхам гібрыдных войн, рэалізацыі сцэнарыяў каляровых рэвалюцый, прымяненнем сіл і правакаваннем унутраных узробеных канфліктаў. Мы ўсё гэта бачым на ўласным досведзе”.

> Мікалай Бузін падкрэсліў, што Дактрына падкрэслівае, што Беларусь гатова з усімі без выключэння краінамі свету будаваць адносіны на аснове ўзаемнага даверу і мірнага суіснавання. Ён назваў Ваенную дактрыну дакументам захавання міру, а не эскалацыі насілля і вайны. “Беларусь заяўляе, што не прымае сілавога дыктату, але заўсёды адкрыта да раўнапраўнага дыялогу. Не мае ні да каго прэтэнзій, але гатова абараняць уласны суверэнітэт і выбраны народам шлях развіцця. Менавіта ў гэтым сутнасць абноўленай Ваеннай дактрыны”, - падкрэсліў ён.

Алена Гірон: «Беларусы, як ніхто іншы, ведаюць каштоўнасць міру»

Дырэктар Браслаўскай гімназіі Алена Гірон з трыбуны Усебеларускага народнага сходу выступіла ад імя ўсіх жанчын і маці Беларусі. Яна падкрэсліла, што за апошнія гады беларусы прывыклі да міру, спакою, стабільнасці. Аднак, па яе словах, сітуацыя вакол нашых граніц, мілітарысцкая рыторыка заходніх краін прымушае людзей ўсё часцей успамінаць такое паняцце як “знешнія пагрозы” і абмяркоўваць, ці будзе вайна. Алена Гірон упэўнена, што ўсё гэта павысіла запыты грамадства на забеспячэнне бяспекі, захаванне незалежнасці і суверэнітэта.

> “Я маці сына, якія марыць аб ваеннай прафесіі. Мы, маці, давяраем арміі самае дарагое, што ў нас ёсць, - нашых дзяцей. Канешне, мы разумеем, што служба ў арміі звязана з рызыкай для жыцця. У той жа час, мы спакойныя, мы адчуваем падтрымку дзяржавы, мы ўпэўненыя, што нашы хваляванні будуць пачутыя. Аб гэтым сведчыць пераемнасць Ваеннай дактрыны, міралюбнасць ваеннай палітыкі нашай краіны”, - сказала Алена Гірон.

(https://www.zvezda.by/)

Валерыя СІЯЦКО, Вераніка КАНЮТА

Фота Лізаветы ГОЛАД, Віктара ІВАНЧЫКАВА

Другі дзень УНС: Атмасфера





(ht





(ht





Фота Лізаветы ГОЛАД

«Гэта вельмі сур'ёзная падзея для нашай краіны» — дэлегат аб УНС

Усебеларускі народны сход — сур'ёзная падзея ў жыцці Беларусі, заявіў дэлегат УНС, старшыня Асіповіцкага райвыканкама Канстанцін Жыгуцкі, паведамляе (https://www.belta.by/society/view/eto-ochen-serjeznoe-sobytie-dlja-nashej-strany-delegat-o-vns-630368-2024/) БелТА.

(https://www.butb.by/)



Фота: БелТА

«Усебеларускі народны сход будзе вырашаць стратэгічныя задачы, тыя праблемы, якія хвалююць нашых людзей. Рашэнні па самых галоўных напрамках развіцця краіны трэба прымаць разам», — выказаў упэўненасць Канстанцін Жыгуцкі.

«Канстытуцыйны статус у УНС — сапраўды, дэлегаты адчуваюць пэўнае хваляванне і адказнасць. Гэта вельмі сур'ёзная падзея для нашай краіны», — падкрэсліў Канстанцін Жыгуцкі.

Шпакоўскі: Беларусь нікому не пагражае, але на нас павінны баяцца напасці

Беларусь нікому не пагражае, але на нас павінны баяцца напасці, заявіў саветнік-пасланнік пасольства Беларусі ў Расіі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Шпакоўскі на палях VII Усебеларускага народнага сходу, перадае (https://www.belta.by/society/view/shpakovskij-belarus-nikomu-ne-ugrozhaet-no-na-nas-dolzhny-bojatsja-napast-630381-2024/) БелТА.



Фота: БелТА

«Цалкам відавочна, што з улікам міжнароднай абстаноўкі Беларусь мае патрэбу ў некаторым пераглядзе асноўных дакументаў у сферы нацыянальнай бяспекі. У першую чаргу размова ідзе аб Ваеннай дактрыне, Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Трэба сказаць, што работа над гэтымі дакументамі вялася ў апошнія гады. Цяперашнім этапе змяніўся характар рызык, пагроз і выклікаў для нашай краіны. Мы адзначаем эскалацыю ваенна-палітычнай напружанасці па перыметры беларускіх меж. свая ваенная прысутнасць паблізу беларускіх межаў. Адзначаем небяспечныя эксперыменты ў сферы ваенна-біялагічнай дзейнасці».

Таму неабходна адаптаваць нацыянальнае заканадаўства такім чынам, каб мы былі гатовы забяспечыць бяспеку нашай дзяржавы, абараніць мір і парадак на беларускай зямлі, адзначыў эксперт. «Міралюбівая палітыка Беларусі зафіксавана ў Канстытуцыі, дзе якраз адлюстраваны характар нашых падыходаў у гэтай сферы: і ў ваеннай, і ў сферы атамнай энергетыкі. Гэта значыць, мы развіваем мірную атамную энергетыку, мы выключаем агрэсію са сваёй тэрыторыі. Але не трэба блытаць міралюбівы характар нашай знешняй палітыкі з пацыфізмам, — падкрэсліў ён. — Справа заключаецца ў тым, што мы знаходзімся ў вельмі цяжкіх знешніх умовах. інструменты аховы і стрымлівання».

«Наша Ваенная дактрына заснавана на прынцыпе прычынення непрымальнай шкоды праціўніку. Каб растлумачыць гэта для абывацеля простымі словамі — на нас павінны баяцца напасці, адносна Беларусі павінны баяцца праявіць нейкія агрэсіўныя памкненні, — дапоўніў Аляксандр Шпакоўскі. — Але, што немалаважна, Беларусь нікому не пагражае. Мы заўсёды гатовы прадаставіць свае добрыя паслугі і свой патэнцыял для дээскалацыі міжнароднай абстаноўкі».

Ляхаў расказаў аб глабальных сэнсах на УНС і месцы Беларусі ў новай карціне светаўладкавання

(https://www.belta.by/)

У новай карціне светаўладкавання месца Беларусі — побач з народамі, аб'яднанымі імкненнем да міру, стабільнасці і паступальнаму развіццю. Такім меркаваннем аб глабальных сэнсах УНС падзяліўся генеральны дырэктар ВА «Беларуснафта» Аляксандр Ляхаў, паведамляе (https://www.belta.by/society/view/ljahov-rasskazal-o-globalnyh-smyslah-na-vns-i-meste-belarusi-v-novoj-kartine-miroustrojstva-630376-2024/) БелТА.



Фота: Беларуснафта

Гендырэктар асаблівую ўвагу звярнуў як на ўзнятыя кіраўніком дзяржавы пытанні маштабнага парадку, так і на вузкія напрамкі. У першы дзень УНС Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка дакладна выклаў сваё бачанне будучага развіцця дзяржавы і абазначыў прыярытэтныя напрамкі. «Ён зноў акцэнтаваў увагу на тым, што ў аснову беларускай эканамічнай мадэлі павінна стаяць эфектыўная эканамічная палітыка, якая з'яўляецца следствам дакладнага геапалітычнага выбару», — адзначыў ён. Паводле слоў Аляксандра Ляхава, калектыў «Беларуснафты» цудоўна разумее гэты пастулат, паспяхова развіваючы нафтаздабыўны і сэрвісны бізнес унутры краіны, на расійскай Поўначы, умацоўвае супрацоўніцтва з Кітаем.

> «У гэтай новай карціне светаўладкавання месца Беларусі — побач з народамі, аб'яднанымі імкненнем да міру, стабільнасці і паступальнаму развіццю», — акрэсліў ён, падкрэсліўшы, што кампаніі «Беларуснафта» сугучныя гэтыя пасылы.

